**22.** Даўней апраналі на кажух шырокае і доўгае адзенне з саматканага сукна з башлыком, каб засцерагчыся ад непагадзі і не прамокнуць. Як называлася такое адзенне?

**А)** мантыя. **Б)** дзяруга. **В)** бурнос. **Г)** андарак. **Д)** рыза.

**23.** Валакно ачасанага лёну называецца … .

**А)** кудзеля. **Б)** кужаль. **В)** дзяруга. **Г)** ворс. **Д)** лямец.

**24.** Музей-сядзіба, дзе нарадзіўся вядомы паэт Адам Міцкевіч, знаходзіцца ў вёсцы … .

**А)** Вязынка. **Б)** Завоссе. **В)** Будслаў. **Г)** Забалацце. **Д)** Халопенічы.

**25.** Якія літаратурныя жанры былі характэрны для старажытнай беларускай літаратуры?

*1) летапісы; 2) апавяданні; 3) словы; 4) эсэ.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных прыкладаў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 3, 4.

**26.** Хто з вядомых мастакоў слова першы пераклаў паэму “Слова пра паход Ігаравы” на беларускую мову?

**А)** Алесь Гарун. **Б)** Ядвігін Ш. **В)** Янка Купала.
**Г)** Максім Багдановіч. **Д)** Аркадзь Куляшоў.

**27.** У якіх з дадзеных словах на месцы пропуску напішаце літару *я*?

*1) рады..грама; 2) рады..экалогія; 3) рады..графія;*
*4) рады..хімія; 5) рады..біёлаг; 6) рады..дыктар.*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** няма патрэбных слоў. **В)** 1, 2. **Г)** 3, 4. **Д)** 5, 6.

**28.** Каму з вядомых мастакоў слова належаць вершаваныя радкі?

*Цудоўны скарб у творчасці народнай*
*для нас сабраны мудрымі дзядамі.*
*Яго адкінуць – значыць без пашаны*
*паставіцца да продкаў працавітых.*

**А)** У. Караткевіч. **Б)** М. Багдановіч. **В)** А. Куляшоў.
**Г)** М. Стральцоў. **Д)** У. Дубоўка.

**29.** Як вядома з гісторыі, у 1708 годзе па загадзе Пятра I была праведзена рэформа рускай графікі. Рэфармаваная кірыліца атрымала назву “грамадзянская азбука”. Узоры літар грамадзянскага алфавіта стварыў беларус … .

**А)** М. Лявіцкі. **Б)** І. Капіевіч. **В)** С. Полацкі. **Г)** Л. Зізаній. **Д)** М. Сматрыцкі.

**30.** Каля Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь устаноўлены помнік Максіму Багдановічу. Хто з беларускіх скульптараў з’яўляецца аўтарам?

**А)** С. Вакар. **Б)** З. Азгур. **В)** А. Бембель. **Г)** А. Глебаў. **Д)** У. Жбанаў.

---

Конкурс арганізаваны і праводзіцца Грамадскім аб’яднаннем «Беларуская асацыяцыя «Конкурс» сумесна з Акадэміяй паслядыпломнай адукацыі пры падтрымцы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

220045, г. Мінск, вул. Яна Чачота, 16 тэл. (017) 372 36 17, 372 36 23
e-mail: info@bakonkurs.by http://www.bakonkurs.by/

ГА «БА «Конкурс». Заказ 16. Тыраж 14100 экз. г. Мінск. 2017 г.

# Конкурс па беларускай мове
# «БУСЛІК-2017»

*Чацвер, 16 лютага 2017 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- карыстацца падручнікамі, канспектамі, справачнай літаратурай і электроннымі сродкамі забараняецца;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання (10 лягчэйшых пытанняў – па 3 балы, 10 найбольш складаных – па 5 балаў, астатнія 10 – па 4 балы); складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- няправільны адказ адзначаецца чвэрцю балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, і залічваецца са знакам «мінус», у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 30 балаў;
- максімальная колькасць балаў, якую можа атрымаць удзельнік конкурсу, – 150, аднак аўтары задання не прадугледжваюць яго поўнага выканання ўдзельнікамі. У заданне гульні-конкурсу ўключаны пытанні, веды пра якія не прадугледжаны школьнай праграмай;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу; пры парушэнні гэтых патрабаванняў удзельнікі могуць быць дыскваліфікаваны;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем і чарнавік удзельнік забірае з сабой;
- вынікі ўдзельнікаў размяшчаюцца на сайце http://www.bakonkurs.by/ праз 1-1,5 месяцы пасля правядзення конкурсу.

---

## Заданне для вучняў 9 класа

**1.** Невядомая дарога на канцы … .

**А)** сяла. **Б)** пасёлка. **В)** носа. **Г)** языка. **Д)** вуліцы.

**2.** Дапоўніце народныя выразы:

*а) Каб вады напіцца, трэба ёй …;* *1) патанцуй;*
*б) Слова давай, дык яго і …;* *2) дапаможа;*
*в) Перш папрацуй, а тады й …;* *3) пакланіцца;*
*г) Вучыся, нябожа, вучэнне … .* *4) трымай.*

**А)** а-1, б-2, в-3, г-4. **Б)** а-2, б-3, в-4, г-1. **В)** а-3, б-4, в-1, г-2.
**Г)** а-4, б-1, в-2, г-3. **Д)** а-2, б-1, в-4, г-3.

**3.** Выберыце з дадзеных сказы, у якіх дзеяслоў ужыты ў форме адзіночнага ліку прошлага часу.

*1) Я часта хаджу па парку.* *2) Прайшла першая навальніца.*
*3) З дрэў апала лісце.* *4) Яны вярталіся нацянькі.*
*5) Прабылі мы ў адпачынку два тыдні.*

**А)** усе сказы, акрамя 1. **Б)** 1, 2. **В)** 2, 3. **Г)** 3, 4. **Д)** 4, 5.

**4.** Дадзены словазлучэнні:

*1)* ***цёплае*** *надвор'е;* *2)* ***свежая*** *думка;*
*3)* ***цёплае*** *слова;* *4)* ***свежая*** *рубашка.*

Падбярыце антонімы да выдзеленых прыметнікаў.

*а) неарыгінальная(-ае); б) гарачае(-ая); в) халоднае(-ая);*
*г) чыстая(-ае); д) брудная(-ае); е) рэзкае(-ая); ё) новая(-ае).*

**А)** 1-б, 2-ё, 3-б, 4-г. **Б)** 1-в, 2-а, 3-е, 4-д. **В)** 1-г, 2-б, 3-в, 4-а.
**Г)** 1-д, 2-в, 3-ё, 4-б. **Д)** 1-е, 2-г, 3-д, 4-в.

**5.** Якія прыслоўі з дадзеных напісаны правільна?

*1) на сустрач; 2) зблізку; 3) з далёку; 4) уверсе; 5) у нізе.*

**А)** усе словы. **Б)** няма патрэбных слоў. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 5.

**6.** У якім з дадзеных сказаў правільна пастаўлены знакі прыпынку пры зваротку?

*1) Дазвольце, вам, мае сябры, пажадаць поспехаў.*
*2) Ляці, маё юнацтва, у даль жыцця!*
*3) Дзе ты, зорка, яркая?*
*4) Спі маленькі мой, сыночак.*
*5) Рана, ты жоўтае лісце апала.*

**А)** 1. **Б)** 2. **В)** 3. **Г)** 4. **Д)** 5.

**7.** Невялікая вежа над будынкам або асобная невялікая пабудова на ўзвышаным месцы, адкуль можна назіраць за наваколлем, называецца … .

**А)** більвідэр. **Б)** бельвідэр. **В)** бельведэр. **Г)** бельведар. **Д)** бельвядэр.

**8.** Выберыце з прапанаваных словазлучэнні.

*1) дзякуючы цярпенню; 2) няхай падумаюць; 3) замерзла вада;*
*4) разам сходзім; 5) сустрэча знаёмых.*

**А)** усе прыклады. **Б)** 1, 2. **В)** 2, 3. **Г)** 3, 4. **Д)** 4, 5.

**9.** Дадзены словазлучэнні: *1) будзённы дзень; 2) будзённае адзенне; 3) будняя пара.* Якое словазлучэнне складзена няправільна?

**А)** усе словазлучэнні складзены правільна.
**Б)** усе словазлучэнні складзены няправільна. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

**10.** Выберыце з дадзеных слоў выклічнік.

*1) гэй; 2) гэты; 3) гэтак.*

**А)** усе словы. **Б)** няма выклічніка. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

**11.** Выберыце з прапанаваных словы, якія напісаны правільна.

*1) шчаслiвы; 2) аванпосны; 3) міласэрдны; 4) праязны; 5) кантрастны.*

**А)** усе словы. **Б)** няма патрэбных слоў. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 5.

**12.** Вызначце тып аднасастаўнага сказа.

*Ужо сцямнела.*

**А)** пэўна-асабовы. **Б)** няпэўна-асабовы. **В)** абагульнена-асабовы.
**Г)** безасабовы. **Д)** назыўны.

**13.** Словы *зябкі, сіверны, сцюдзёны* з'яўляюцца паміж сабой … .

**А)** сінонімамі. **Б)** антонімамі. **В)** амонімамі.
**Г)** паронімамі. **Д)** мнагазначнымі словамі.

**14.** У якіх выразах на месцы пропуску напішаце часціцу *ні*?

*1) __ тое __ сёе; 2) нельга __ заўважыць;*
*3) __ гуку ў адказ; 4) што б __ гаварылі.*

**А)** усе выразы. **Б)** няма патрэбных выразаў.
**В)** усе выразы, акрамя 2. **Г)** 1, 2. **Д)** 3, 4.

**15.** Транскрыпцыя якіх слоў з дадзеных зроблена правільна?

1) [с'н'эжань]; 2) [в'ас'олка]; 3) [л'ів'эн']; 4) [пад'йэзд].

**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных прыкладаў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**16.** Якія з дадзеных слоў у рускай і беларускай мовах адрозніваюцца месцам пастаноўкі націску?

*1) дошка; 2) вусы; 3) майстар; 4) агрэгат.*

**А)** усе словы. **Б)** няма патрэбных слоў. **В)** толькі 1. **Г)** 1, 2. **Д)** 3, 4.

**17.** Вызначце простыя словазлучэнні.

*1) наш новы журналіст; 2) менш знаёмы акцёр;*
*3) блакітны небасхіл; 4) заўсёды імкнуцца да ведаў.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных прыкладаў.
**В)** усе прыклады, акрамя 4. **Г)** 1, 4. **Д)** 2, 3.

**18.** У якіх сказах на месцы пропуску патрэбна паставіць коскі?

*1) Лес _ атулены змрокам і цішынёю _ стаяў нерухома.*
*2) Надвячоркам пайшоў дождж _ па-майску цёплы і дробны.*
*3) Непрыглядная знадворку _ хата ў сярэдзіне была даволі ўтульнай.*

**А)** ва ўсіх сказах. **Б)** няма патрэбных сказаў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

**19.** Вызначце словазлучэнні, галоўным словам у якіх з'яўляецца лічэбнік.

*1) дзесяць вучняў; 2) адны арэлі;*
*3) тры чацвёртыя ўдзельнікаў; 4) сямі чалавек.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных прыкладаў. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 4.

**20.** Выдзеленыя словы ў пары словазлучэнняў ***абагуленая*** *гаспадарка* – ***абагульнены*** *вопыт* з'яўляюцца … .

**А)** сінонімамі. **Б)** антонімамі. **В)** амонімамі.
**Г)** паронімамі. **Д)** мнагазначнымі словамі.

**21.** Якія знакі прыпынку неабходна паставіць на месцы пропускаў у сказе?

*Вада была чыстая _ празрыстая _ і я лёг на жывот _ каб прыгледзецца да свайго адлюстравання _ але нічога асаблівага_ а тым больш прыгожага _ там не заўважыў.*

**А)** 1 коска, двукроп'е, працяжнік, 3 коскі. **Б)** 2 коскі, працяжнік, 3 коскі.
**В)** 5 косак, працяжнік. **Г)** 6 косак.
**Д)** 1 коска, працяжнік, 2 коскі, працяжнік, 1 коска.